ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 5 (1003) ● ЧАЦВЕР, 22 лютага 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

# НАША ГЕРАІЧНАЯ АРМІЯ

У абставінах велізарнага працоўнага і палітычнага ўздыму, выкліканага рашэннямі XXIV з'езда, святкаваннем 50-годдзя ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, адзначае савецкі народ 55-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту.

Пяцьдзесят пяць год нашы Узброеныя Сілы пільна стаяць на варце мірнай стваральнай працы савецкага народа, на варце міру ва ўсім свеце.

У. І. Ленін вучыў, што ўсякая рэвалюцыя толькі тады чаго-небудзь каштуе, калі яна ўмее абараняцца. Выконваючы запаветы Уладзіміра Ільіча, Камуністычная партыя і Савецкі ўрад, савецкі народ не шкадавалі сіл і сродкаў для стварэння і ўмацавання арміі як галоўнага сродку абароны сацыялістычнай Айчыны ад агрэсіі міжнароднага імперыялізму. Партыя распрацавала прынцыпы арганізацыі Узброеных Сіл пралетарскай дзяржавы, стала іх кіраўніком і выхавальнікам, а затым узначаліла работу па ўдасканаленню савецкай ваеннай арганізацыі.

Чырвоная Армія з гонарам вытрымала грозныя выпрабаванні ў гады грамадзянскай вайны і іншаземнай ваеннай інтэрвенцыі. Байцы і камандзіры маладой арміі Краіны Саветаў у кравапралітных баях з ворагамі Айчыны паказалі ўзоры гераізму і бязмежнай адданасці ідэалам сацыялізму. Нягледзячы на разруху ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы і на транспарце, недахоп зброі, Чырвоная Армія разграміла шматлікіх ворагаў.

Савецкія Узброеныя Сілы з гонарам выканалі свой абавязак перад савецкім народам і ўсім чалавецтвам і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У працяглай і жорсткай барацьбе яны знішчылі германскі фашызм і японскі мілітарызм, адстаялі свабоду і незалежнасць савецкага народа, вызвалілі народы свету ад фашысцкага нашэсця.

У пасляваенныя гады Савецкая Армія і Ваенна-Марскі Флот верна служаць сацыялістычнай Айчыне, дастойна выконваюць ускладзеныя на іх высокія і адказныя задачы.

Камуністычная партыя ў сваёй новай Праграме абвясціла, што яна «разглядае абарону сацыялістычнай Айчыны, умацаванне абароны СССР, магутнасці Савецкіх Узброеных Сіл як свяшчэнны абавязак партыі, усяго савецкага народа, як важнейшую функцыю сацыялістычнай дзяржавы».

Дзякуючы клопатам партыі і гераічнай працы савецкага народа, нашы Узброеныя Сілы непазнавальна змяніліся. Яны атрымалі на ўзбраенне першакласную баявую зброю і навейшую тэхніку.

Новым буйным крокам у далейшым развіцці і ўмацаванні Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту з'явіліся рашэнні XXIV з'езда КПСС, новы Закон СССР «Аб усеагульным воінскім абавязку», прынятыя сесіяй Вярхоўнага Савета СССР 12 кастрычніка 1967 года.

Магутнымі, непарушнымі сустракаюць Узброеныя Сілы Краіны Саветаў сваю 55-ю гадавіну. Яны заўсёды гатовы з гонарам і годнасцю выканаць любыя задачы па абароне дзяржаўных інтарэсаў Савецкага Саюза.

# ВІНШУЕМ ЮБІЛЯРА

## ГЕРОЮ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ А. Н. СЕЎЧАНКУ — 70 ГОД



Імя Антона Нікіфаравіча Сеўчанкі добра вядома кожнаму члену універсітэцкага калектыву, працоўным і навуковай грамадскасці рэспублікі. Далёка за мяжой ведаюць А. Н. Сеўчанку як выдатнага вучонага і грамадскага дзеяча. Сёння акадэміку АН БССР, дырэктару інстытута прыкладных фізічных праблем БДУ Антону Нічыпаравічу Сеўчанку спаўняецца 70 год.

У віншавальным адрасе юбіляру гаворыцца:

«Дарагі Антон Нікіфаравіч!

Шматтысячны калектыў выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, рабочых і служачых, аспірантаў і студэнтаў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна горача віншуе Вас з 70-годдзем з дня нараджэння і 50-годдзем вялікай навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

Увесь Ваш вялікі і слаўны шлях ад выкладчыка сельскай школы да вядомага вучонага і выдатнага арганізатара навукі з'яўляецца яскравым прыкладам рэалізацыі неабмежаваных магчымасцей развіцця асобы ў сацыялістычным грамадстве, прыкладам камуністычных адносін да выканання свайго абавязку.

Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта і да цяперашняга часу Вы паказваеце прыклад нястомнага працаўніка, прынцыповага і сумленнага камуніста, прадаўжальніка выдатных традыцый Вашага настаўніка С. І. Вавілава.

Мы ведаем Вас, дарагі Антон Нікіфаравіч, як буйнага вучонага-фізіка, чые працы атрымалі высокае прызнанне ў нашай краіне і за мяжой, цудоўнага арганізатара навукі, аднаго са стваральнікаў беларускай школы фізікаў. Сярод Вашых вучняў два члены-карэспандэнты АН БССР, шэсць дактароў і каля 40 кандыдатаў навук.

Вялікая Ваша заслуга і як рэктара Беларускага дзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, на пасту якога Вы плённа працавалі больш 15 год.

Вашы заслугі перад беларускім народам і нашай Радзімай высока ацэнены партыяй і ўрадам, якія прысвоілі Вам званне Героя Сацыялістычнай Працы і ўдастоілі высокіх урадавых узнагарод. Вашы асабістыя якасці як вучонага і чалавека, які заўсёды спагадліва і добразычліва адносіцца да супрацоўнікаў і калег, Ваша асабістая сціпласць, выключная працавітасць, пачуццё адказнасці і высокая патрабавальнасць да сябе з'яўляюцца для ўсіх нас яскравым прыкладам самаадданага служэння нашай сацыялістычнай Радзіме.

Дазвольце, дарагі Антон Нікіфаравіч, пажадаць Вам моцнага здароўя, доўгіх год творчага жыцця, бадзёрага настрою, вялікага асабістага шчасця, новых дасягненняў у развіцці навукі і выхаванні высокакваліфікаваных спецыялістаў».

# ВЯЛІКІ СЫН ПОЛЬСКАГА НАРОДА

*Грамадскасць Мінска 16 лютага адзначыла 500-годдзе з дня нараджэння выдатнага сына польскага народа, вялікага вучонага-астранома Мікалая Каперніка.*

*У актавай зале Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна адбыўся гарадскі вечар, арганізаваны камісіяй БССР па справах ЮНЕСКО, Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, Беларускім аддзяленнем Таварыства савецка-польскай дружбы.*

*Вечар адкрыў старшыня прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі Г. Г. Чарнушчанка.*

*З дакладам «Жыццё і дзейнасць Мікалая Каперніка» выступіў член-карэспандэнт АН БССР, прафесар У. Г. Вафіядзі. Дацэнт БДУ А. А. Бірала зрабіў паведамленне на тэму «Капернік і Беларусь».*

*Перад прысутнымі выступіў генеральны консул ПНР у Мінску Алоіз Валяшак.*

*На вечары прысутнічала намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова.*

*У фае актавай залы універсітэта разгорнута выстаўка аб жыцці і дзейнасці Мікалая Каперніка, наладжаная генеральным консульствам ПНР у Мінску.*

*(БЕЛТА).*



**НА ЗДЫМКУ: выступае генеральны консул ПНР А. Валяшак.**

**Фота Д. ПРЭСА.**

# ПАРТЫІ І РАДЗІМЕ ВЕРНЫЯ

Закончыўся рэспубліканскі злёт студэнтаў, у якім прынялі ўдзел 1100 лепшых прадстаўнікоў трохсоттысячнай арміі студэнтаў.

Ішла сур'ёзная размова па пытаннях вучобы, камуністычнага выхавання, навуковай работы.

У дакладзе міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкова былі прыведзены цікавыя лічбы і факты:

29 вну рэспублікі рыхтуюць зараз спецыялістаў амаль 170 прафесій, а 129 тэхнікумаў і вучылішч вядуць падрыхтоўку па 210 спецыяльнасцях;

дзевяць працэнтаў студэнтаў завяршылі мінулы навучальны год толькі на выдатна, 39 працэнтаў—на добра і выдатна. Гэта залаты фонд вышэйшай школы рэспублікі. Але 4 з кожных 100 студэнтаў вучацца толькі на здавальняюча, прычым большую колькасць нізкіх ацэнак даюць студэнты малодшых курсаў, якія не авалодалі яшчэ навыкамі самастойнай работы. Значыць, трэба аказваць ім сур'ёзную дапамогу;

каля 40 працэнтаў студэнтаў дзённых аддзяленняў вну рэспублікі актыўна ўдзельнічаюць у навукова-даследчай і канструктарскай рабоце. Толькі ў нашым універсітэце студэнцкае навуковае таварыства налічвае 6,5 тысячы чалавек. За адзін мінулы год студэнтамі рэспублікі атрымана 20 патэнтаў і аўтарскіх пасведчанняў;

каля тысячы замежных студэнтаў з 353 краін свету навучаюцца сёння ў вну і тэхнікумах рэспублікі. Заканчваючы сваю прамову, таварыш Мяшкоў сказаў:

— Студэнты — наша будучае, наша змена. З імі—дзецьмі рабочых і сялян, працоўнай інтэлігенцыі, дзецьмі народа—звязваем мы свае надзеі на паспяховае ажыццяўленне вялікіх ідэалаў камунізму. Мы ўпэўнены — яны апраўдаюць гэтыя спадзяванні! Апраўдаюць поспехамі ў вучобе і актыўным удзелам у рэалізацыі рашэнняў XXIV з'езда КПСС, планаў трэцяга, рашаючага года пяцігодкі.

# УЗНАГАРОДЫ ВЕТЭРАНАМ

Плённа працуюць ва універсітэце больш 350 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых партызан і падпольшчыкаў. Гэтыя людзі ў суровы ваенны час мужна вялі гераічную барацьбу з ворагам на франтах у розных родах войск, змагаліся ў падполлі і ў партызанскіх лясах, а ў мірныя дні аддаюць свае веды, вопыт, уменні маладому пакаленню, выхоўваюць моладзь патрыётамі сваёй вялікай Радзімы. Універсітэцкая арганізацыя ветэранаў вайны, якую ўзначальвае генерал-маёр у адстаўцы Аляксандр Васільевіч Кірсанаў, заваявала аўтарытэт лепшай у рэспубліцы.

Напярэдадні свята на ўрачыстых сходах поспехі нашых ветэранаў адзначаны новымі ўзнагародамі: «Почетный Знак СКВВ» уручан В. Р. Заўрыеву, Ф. Ф. Церашонку, нагрудным знакам Савецкага Камітэта ветэранаў вайны ўзнагароджаны У. М. Сікорскі, І. Р. Некрашэвіч, М. Я. Зайцаў. Аб'яўлена падзяка І. М. Жмака і М. Т. Раманоўскаму.

За актыўны ўдзел у рабоце па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў 30 выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ ўзнагароджаны граматамі Беларускага рэспубліканскага савета ветэранаў вайны.

М. АНОСАЎ.

# У ГОНАР 55-й ГАДАВІНЫ

Разам з усімі працоўнымі нашай Радзімы 55-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту рыхтуюцца сустрэць дастойнымі патрыятычнымі справамі арганізацыі Добраахвотнага абароннага таварыства.

Рашэннем ЦК ДТСААФ БССР з 23 студзеня 1973 года праводзіцца традыцыйны месячнік абаронна-масавай работы. Дэвіз месячніка: «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё!»

Важнейшай задачай месячніка з'яўляецца прапаганда ленінскіх запаветаў пра абарону сацыялістычнай Айчыны, растлумачэнне ролі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада ва ўмацаванні абараназдольнасці краіны, слаўных рэвалюцыйных і баявых традыцый савецкага народа і яго Узброеных Сіл, Закона аб усеагульным воінскім абавязку.

Арганізацыі ДТСААФ універсітэта праводзяць вялікую работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню членаў таварыства: арганізуюцца сустрэчы студэнтаў з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, Героямі Савецкага Саюза; тэматычныя вечары і вечары, прысвечаныя 55-й гадавіне Узброеных Сіл СССР. Абноўлена наглядная агітацыя.

19 лютага перад студэнтамі, якія праходзяць навучанне на ваеннай кафедры, выступіў ветэран Вялікай Айчыннай вайны, падпалкоўнік запасу Аляксей Мікалаевіч Тальны.

Добра арганізавана работа па выкананню ўмоў месячніка ў арганізацыі ДТСААФ біялагічнага факультэта (старшыня камітэта М. С. Марозік). У гэтай арганізацыі праводзіцца шмат цікавых мерапрыемстваў. Арганізацыя датэрмінова выканала план па рэалізацыі латарэйных білетаў і збору членскіх узносаў.

Многа мерапрыемстваў праведзена ў перадсвяточныя дні і адбудзецца ў дзень святкавання. Студэнты сустрэнуцца з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і Героямі Савецкага Саюза ля стэндаў музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, наведаюць падшэфныя воінскія часці, дзе сустрэнуцца з выдатнікамі баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

На фізічным, хімічным, гістарычным і іншых факультэтах праходзяць урачыстыя вечары. Праводзяцца спаборніцтвы на першынство факультэтаў па кулявой стральбе і здача норм на значок ГПА па кулявой стральбе. Ёсць усе падставы меркаваць, што ўмовы месячніка абаронна-масавай работы будуць выкананы паспяхова.

М. ГАРЛАТАЎ,
старшыня камітэта ДТСААФ.

## ВЫСОКАЯ АДЗНАКА

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за поспехі ў вучобе, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ўдарную працу ў будаўнічых атрадах лепшыя студэнты вну і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў рэспублікі ўзнагароджаны Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Ганаровай граматы Вярхоўнага Савета БССР удастоен студэнт IV курса аддзялення палітэканоміі БДУ **Уладзімір Анцімонік.** Сярод узнагароджаных граматамі Вярхоўнага Савета БССР — студэнтка V курса філфака БДУ **Тамара Ганчарова,** студэнт III курса журфака **Міхаіл Нікішын,** студэнт V курса матфака **Іван Сандрыгайла.**

Мы сардэчна віншуем сяброў з высокімі ўзнагародамі і шчыра радуемся разам з імі.

# З НОВАЙ ЭНЕРГІЯЙ




Рэспубліканскі злёт сабраў лепшых прадстаўнікоў студэнцтва нашай рэспублікі. Ён праходзіў пад лозунгам «Кожнаму камсамольцу, кожнай групе — ударную камсамольскую справу». Удзельнікі злёту абмеркавалі пытанне аб пабудове работы студэнцкіх арганізацый для паспяховага выканання задач, пастаўленых перад вышэйшай школай XXIV з'ездам КПСС.

Моладзь заўсёды была ў першых радах барацьбітоў і творцаў, на першых суботніках, на франтах грамадзянскай і Айчыннай войнаў, у асваенні цаліны, на буйнейшых будоўлях краіны. І перш чым прыступіць да рашэння хвалюючых пытанняў, мы прыйшлі да помніка-абеліска воінам Савецкай Арміі, да помніка вялікаму правадыру і настаўніку У. І. Леніну, каб аддаць вялікую даніну павагі людзям, ідэі і справы якіх нам прадаўжаць.

У 10 гадзін раніцы 16 лютага ў акруговым Доме афіцэраў пачалося пленарнае пасяджэнне злёту. Па даручэнню бюро ЦК ЛКСМБ У. І. Падрэз адкрывае злёт. Пад урачыстыя гукі музыкі ў залу ўносяць святыя рэліквіі беларускай моладзі — сцяг рэспубліканскай камсамольскай арганізацыі, Пераходны чырвоны сцяг ЦК ВЛКСМ.

На злёце з дакладам выступіў сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў, які ўказаў на важнасць паляпшэння падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.

З дакладам «Аб ролі студэнцкіх калектываў у выкананні задач, пастаўленых перад вышэйшай школай XXIV з'ездам КПСС», выступіў міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў.

Дакладчык падкрэсліў тыя новыя патрабаванні да падрыхтоўкі кадраў, якія прад'яўляе сённяшні этап камуністычнага будаўніцтва, тэмпы навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

Таварыш М. М. Мяшкоў прызваў змагацца за глыбокае аваладанне ведамі, актыўна ўдзельнічаць у творчай навукова-даследчай рабоце.

На змену старэйшым таварышам на трыбуну падымаюцца студэнты. Камсамольскі задор, мэтанакіраванасць гучаць у іх выступленнях.

Многа было выказана на злёце прапаноў, якія заслужылі ўвагу. Напрыклад, А. Ізюмскі, сакратар камітэта камсамола БПІ, прапанаваў даць магчымасць студэнцкім будаўнічым атрадам працаваць у час працоўнага семестра па спецыяльнасцях. Гэта дасць магчымасць яшчэ раз на практыцы замацаваць тэарэтычныя веды, набыць навыкі ў рабоце. Або яшчэ. Студэнты педагагічных інстытутаў заканчваюць заняткі ў канцы чэрвеня, калі ў піянерскіх лагерах укамплектаваны штат важатых. А будучым педагогам было б вельмі карысна папрацаваць з піянерамі, каб лепш падрыхтавацца сябе да працы ў школе.

Адной з важнейшых задач была і застаецца задача выхавання камуністычнай перакананасці ў кожнага спецыяліста, кім бы ён ні быў: педагогам або акцёрам, урачом, інжынерам або аграномам.

Гэтыя і іншыя пытанні абмяркоўвалі мы, дэлегаты рэспубліканскага злёту студэнтаў.

Злёт закончан. Раз'ехаліся ва ўсе канцы рэспублікі задорныя юнакі і дзяўчаты, везучы з сабой новыя планы, рашэнні, адрасы новых сяброў.

**Л. АГАРОДНІК,**
**студэнтка філфака.**

## КОЖНАЙ ГРУПЕ, КОЖНАМУ КАМСАМОЛЬЦУ — УДАРНУЮ СПРАВУ

**Пад такім дэвізам пачаліся на факультэтах камсамольскія сходы ў адказ на пастанову партыі і ўрада аб сацыялістычным спаборніцтве ў трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі.**

**Для правядзення сходаў у кожнай групе створаны камісіі, у якія ўваходзяць радавыя камсамольцы, куратар, прадстаўнік ад партыйнай арганізацыі, камсорг.**

**Сходы будуць праходзіць у плане арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў, таму размова на іх будзе і аб выніках зімовай сесіі, і аб стане палітыка-выхаваўчай работы па ўсіх напрамках камсамольскай дзейнасці.**

**Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на работу ў інтэрнатах, здачу норм ГПА, навукова-даследчую і прапагандысцкую работу. Сходы павінны паставіць канкрэтныя задачы на новы семестр.**

**Будуць вызначаны таксама групавыя заданні і сацыялістычныя абавязацельствы для кожнага камсамольца. Заданнем для груп у цэлым можа быць шэфства над класам, школай, піянерскім пакоем, сувязь з прадпрыемствамі, калгасамі, саўгасамі; арганізацыя прадметных гурткоў, клубаў, спартыўных секцый, атрадаў па ахове прыроды, «зялёных патрулёў», школ юных матэматыкаў, фізікаў, гісторыкаў, хімікаў, журналістаў, біёлагаў і г. д.**

**Трэба звярнуць увагу на выкананне камсамольскіх даручэнняў. Зрабіць так, каб у кожнага камсамольца было сур'ёзнае грамадскае даручэнне. Камсамольскія сходы «Кожнай групе, кожнаму камсамольцу — ударную справу» стануць пачаткам вялікай работы студэнтаў універсітэта ў трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі, а таксама па шырокаму разгортванню грамадска-палітычнай практыкі.**

**Прэс-цэнтр камітэта камсамола.**

*Кафедра геадэзіі і картаграфіі працуе над стварэннем карты тыпалогіі населеных пунктаў БССР. Такая работа праводзіцца ўпершыню і мае вялікае навуковае і практычнае значэнне. Удзельнічаюць у навуковых даследаваннях кафедры і студэнты III—IV курсаў.*

*НА ЗДЫМКУ: выкладчыкі кафедры і студэнты абмяркоўваюць курсавыя работы.*

Фота *Д. Чаховіча.*



*СТУДЭНЦКАЕ ПІСЬМО*

## НАС ЧАКАЮЦЬ

Больш 200 кіламетраў праехала па Вілейскаму раёну агітбрыгада нашага факультэта ў час зімовых канікул. Пяць канцэртаў, пяць лекцый аб універсітэце праслухала 780 чалавек. Гэта чацвёрты рэйд нашай агітбрыгады, у геаграфію канцэртаў якой уваходзяць Мінскі, Валожынскі, Бярэзінскі, Вілейскі, Стаўбцоўскі, Слуцкі раёны Мінскай вобласці і Асіповіцкі раён Магілёўскай вобласці. За сваю гісторыю (пачынаючы з 21 снежня 1970 года) агітбрыгада дала 35 канцэртаў, прачытаны дзесяткі лекцый, гледачамі і слухачамі якіх былі больш 8 тысяч чалавек. На нашым рахунку больш 5 тысяч кіламетраў шляху.

Сесія заўсёды ўносіць змяненні ў састаў агітбрыгады, і таму у цяперашнім рэйдзе ў пачатку прыйшлося шмат папрацаваць на рэпетыцыях, саміх канцэртах. Першы канцэрт у калгасе «Бальшавік» і апошні ў калгасе імя У. І. Леніна прайшлі асабліва паспяхова. Запомнілася выступленне перад навучэнцамі 8—10 класаў у сярэдняй школе № 3 горада Вілейкі. Цэлы шэраг нумароў выконваўся на біс, асаблівае ажыўленне выклікалі сцэнкі са студэнцкага жыцця.

Састаў агітбрыгады не пастаянны. Прыемна адзначыць, што не адарваны ад калектыву былыя выпускнікі факультэта, такія, як Н. Бесман, Л. Мокіна. Па меры магчымасці яны прымаюць удзел у канцэртах. Гэты рэйд вызначаўся і тым, што па сутнасці ўпершыню ў ім прымалі ўдзел выкладчыкі. Асістэнт кафедры МЗ АСК І. І. Млынчык быў кіраўніком рэйду і ў той жа час сам выступаў на сцэне, дапамагаў парадамі.

З ліку ўдзельнікаў хочацца адзначыць Л. Макарэвіча (III курс), Т. Крупень, А. Сянько, А. Дунаева — (II курс), А. Тусаву — (I курс). Яны ж прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх выступленнях агітбрыгады.

Рэйд, канцэрты — гэта вельмі весела, вельмі цікава, вельмі цяжка. Шкада, што агітбрыгады іншых факультэтаў не ўдзельнічаюць у падобных мерапрыемствах, шкада, што няма агульнауніверсітэцкай агітбрыгады, як у медінстытуце, БПІ. Па-мойму, камітэту камсамола, праўленню клуба трэба ў бліжэйшы час выправіць гэтую памылку, таму што канцэртаў нашых чакаюць, яны вельмі патрэбны людзям.

**А. НОВІКАЎ**
**студэнт IV курса ФПМ, кіраўнік агітбрыгады.**

## ДРУГІ ДОМ

**Паркавая, 9... Хто ва універсітэце не ведае гэтага адраса? Так, гэта інтэрнат, дзе жывуць журналісты, біёлагі, філолагі. Жывуць дружна, калі-нікалі спрачаюцца. Часцей за ўсё аб тым, чый факультэт лепшы. Спрачаюцца да хрыпаты, але пытанне да гэтай пары так і не высветлена. У астатнім жа дапамагаюць законы дружбы.**

**Прайшоў першы семестр. Якія ж яго вынікі? З гэтым і іншымі пытаннямі аб жыцці студэнтаў у інтэрнаце мы звярнуліся да членаў студсавета і студэнтаў.**

**— Што было зроблена за першы семестр? Па-першае, закончылі афармленне ленінскага пакоя і чытальнай залы, — расказвае А. Міхальчанка. — У нішах і на паверхах з'явіліся маляўнічыя стэнды. Заадно там жа былі створаны ўмовы для заняткаў і адпачынку.**

**Па-другое, наладзілі выпуск трох газет: сатырычнай «Мятла», насценнай «Паркавая магістраль», радыёгазеты «Мы ў эфіры».**

**Шмат праблем яшчэ, канешне, не вырашана. Але ужо сёння наш інтэрнат займае 2-е месца па выніках сацспаборніцтва у гонар 50-годдзя СССР. У гэтым вялікая заслуга актывістаў: Любы Ларыёнавай — старшыні жылбыткамісіі, Людмілы Хількевіч — культмасавы сектар, Валерыя Дранчука, Віктара Кубекі, Тамары Філімонавай.**

**Добра вядуць грамадскую работу студэнты біяфака. Уладзіслава Ус шмат клопатаў аддае санпастам у інтэрнаце. Яна была арганізатарам лекцыі «Аб шкодных прывычках», якая запомнілася ўсім. Студэнт, камуніст Васіль Барысёнак, старшыня савета ленінскага пакоя, перйтварыў яго знешні выгляд. Валя Гайшун, Людміла Сялюк, Уладзімір Барай і шмат іншых не застаюцца ў баку ад усіх пачыннянняў і спраў студсавета. Наперадзе ў нас яшчэ шмат цікавых спраў, у бягучым семестры мы будзем змагацца за ўзорны парадак у нашым доме.**

**О. ЗУБ,**
**студэнтка біяфака.**

## ВАРТА ЗАДУМАЦЦА

Нашы аўдыторыі заўсёды чыстыя і праветраныя. Але ці такімі ж мы іх пакідаем пасля заняткаў?

Шматкі паперы, шалупінне семечак часта можна ўбачыць у партах або на падлозе. Ля дошкі паркет «размалёўвае» раскрышаная крэйда, на падаконніках ляжаць прачытаныя газеты. У туалетах дзе папала валяюцца цыгарэтныя акуркі, змятыя карабкі ад запалак, а ля вадаправода стаяць лужы бруднай вады.

Мы вывучаем элементы вышэйшай матэматыкі або лексікалогіі, але, аказваецца, не ведаем, як прытрымлівацца элементарных норм парадку і чысціні. Выходзіць, школьнікі ў гэтых адносінах больш адукаваныя за нас. Яны, калі ўжо насмецяць, дык самі прыбіраюць за сабой. А мы, захопленыя сваімі інтарэсамі, не заўважаем тых, хто з дня ў дзень займаецца прыбіраннем памяшканняў.

Напэўна, варта задумацца аб іх нялёгкай працы і, уваходзячы ў будынак, усё-такі выціраць ногі, а ў аўдыторыі паступаць, як дома, дзе нікому не прыходзіць у галаву пісаць на сталах, ламаць крэслы, кідаць на падлогу паперу.

**С. СВЯТЛОВА.**

*СТУДЭНЦКАЕ ПІСЬМО*



*У лабараторыі фізічнай электронікі часта можна бачыць студэнта V курса аддзялення радыёфізікі М. Нікіфарэнку. Ён працуе над дыпломнай работай на тэму «Канструяванне апаратуры для аўтаматычнай апрацоўкі эмісійных працэсаў», якая звязана з далейшай распрацоўкай пытанняў мікраэлектронікі.*

Фота *Д. Чаховіча.*

## ВУЧОБА АКТЫВУ СНТ

У час зімовых канікул на турбазе ЧБВА «Ждановічы» праходзіла вучоба актывістаў студэнцкіх навуковых таварыстваў рэспублікі. «На пярэднім краі навукі, культуры, мастацтва» — дэвіз трэцяга па ліку злёту. У ім прынялі ўдзел 17 актывістаў СНТ нашага універсітэта. Разам з прадстаўнікамі іншых навучальных устаноў рэспублікі яны праслухалі лекцыі аб навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, выкарыстанні ЭВМ, праблемах і перспектывах мембраннай біялогіі, пазнаёміліся з дасягненнямі сучаснай квантавай электронікі і хіміі. Перад удзельнікамі вучобы выступілі таксама кінадраматург К. Л. Губарэвіч, артыстка тэатра імя Я. Купалы З. І. Браварская, удзельнікі XX Алімпійскіх гульняў, пераможцы Усесаюзнага конкурсу па праблемах грамадскіх навук і гісторыі ВЛКСМ.

Былі арганізаваны паездкі на камвольны камбінат, у мастацкі музей, на Курган Славы і мемарыяльны комплекс «Хатынь». Праводзіліся спаборніцтвы па настольнаму тэнісу, шахматах, лыжах.

У заключны дзень перад прысутнымі выступілі намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР І. І. Леановіч і сакратар ЦК ЛКСМБ В. І. Радомскі. Яны пажадалі ўдзельнікам семінара новых творчых адкрыццяў.

**А. САЧАНКА.**

# І ЎДЗЯЧНАСЦЬ, І ЛЮБОЎ ТАБЕ!

**Напярэдадні 30-годдзя Сталінградскай бітвы ў легендарны горад з усіх куткоў Савецкага Саюза з'ехаліся геаічныя яго абаронцы. У саставе беларускай групы ветэранаў былі прадстаўнікі нашага універсітэта — генерал-маёр у адстаўцы А. В. Кірсанаў і прафесар В. Р. Заўрыеў.**

**Мы папрасілі Віктара Рыгоравіча Заўрыева падзяліцца ўражаннямі аб гэтай паездцы.**

## Вогненная маладосць

— Сталінград звязаў нас з Аляксандрам Васільевічам Кірсанавым воінскім брацтвам. Ён быў камандзірам 157-й стралковай дывізіі, я камандаваў асобным сапёрным батальёнам у гэтай дывізіі. І таму сустрэча з горадам нашай баявой маладосці, дзе мы перажылі горыч страт і шчасце перамогі, была вельмі хвалюючай.

Валгаград сустрэў нас амаль такім жа марозам, як у 1942 годзе, і пазёмкай, але нам было цёпла і ўтульна ад сардэчнай шчырасці і гасціннасці валгаградцаў. Мабыць, не засталося ні аднаго вытворчага калектыву, установы, школы, дзе б не чакалі былых воінаў-сталінградцаў.

Я ўжо гады тры перапісваюся з навучэнцамі тэхнічнага вучылішча № 5, і мой першы візіт быў, вядома, ім.

Выступаць давялося вельмі многа. Аляксандру Васільевічу разоў з трыццаць, мне некалькі менш.

Ускалыхнула ўспаміны наведанне месц у раёне Бекетаўкі, цяпер Кіраўскі раён, дзе наша дывізія стойка абаранялася, не аддаўшы фашыстам ні метра зямлі, і адкуль перайшла ў наступленне. Знайшлі мы старую царкву, дзе былі нашы штабы, дом, куды бегалі па ваду. Прырода і людзі згладзілі прыкметы вайны, але для нас, ветэранаў, яны засталіся насечкамі ў сэрцы.

Цікавымі былі сустрэчы з таварышамі па дывізіі, гутаркі пра мінулыя баі і сённяшнія, такія розныя нашы мірныя справы.

У памяць аб 30-годдзі вялікай бітвы нам уручылі значкі «Ветерану 64-7 гвардейской армии», герб горада, памятны медаль, сувеніры.

І ўвесь гэты час падарожжаў, сустрэч, успамінаў мы адчувалі сябе, як і ў тыя далёкія і суровыя, вельмі адказныя і цяжкія ваенныя дні, часцінкай вялікай арміі, вялікага народа.

## У ПЕРАМОЖНЫМ СОРАК ПЯТЫМ

У ПЕРАМОЖНЫМ 1945 годзе мне выпала сустрэць 27-ю гадавіну Савецкіх Узброеных Сіл у гарачых, баявых абставінах. У ходзе Вісла-Одэрскай аперацыі наша злучэнне з баямі прайшло каля 580 кіламетраў, вызваліла сотні польскіх гарадоў і населеных пунктаў, з ходу фарсіравала раку Одэр у раёне горада Лебус. Да Берліна заставалася каля 70 кіламетраў. Кідаючы ў бой апошнія рэзервы, праціўнік спрабаваў скінуць наступаючыя часці з плацдарма ў бурлівы Одэр.

Старлковы батальён, які падтрымлівала наша батарэя, атрымаў заданне выбіць праціўніка з групы асобных дамоў на паўночнай ускраіне горада, захапіць шасэйную дарогу і замацавацца на яе рубяжы.

Атака пачалася на світанні 22 лютага. Падтрыманыя агнём батарэй артылерыйскага палка з усходняга берага Одэра, пехацінцы і артылерысты імкліва атакавалі праціўніка і захапілі тры дамы з групы. На даху аднаго з іх і быў абсталяван назіральны пункт. Уваходы і аконныя праёмы пограба, звернутыя ў бок праціўніка, былі забарыкадзіраваны, а дом падрыхтаван да кругавой абароны.

Восем раз праціўнік пасылаў падраздзяленні пяхоты і танкаў у контратакі супраць воінаў, якія заселі ў дамах, і кожны раз адкочваўся назад, пакідаючы забітых, раненых і палаючыя машыны.

У другой палове дня праціўніку ўдалося ўпрытык падысці да нашага назіральнага пункта. Два нямецкія танкі, прыкрываючыся сценамі нашага дома, адкрылі агонь па падраздзяленнях батальёна. Трэба было зараз жа знішчыць гэтыя танкі. Праз вокны другога паверха закідваем іх гранатамі, і два велізарныя палаючыя факелы робяць спробу адысці назад да сваіх, але хутка заміраюць у бездапаможнасці.

Уверх узлятае серыя чырвоных ракет — сігнал да атакі. Падраздзяленні батальёна накіроўваюцца ўперад да шасэйнай дарогі. Бліжэйшая задача выканана. Цяпер трэба прымаць меры да адпору контратак праціўніка. Хутчэй закапацца ў зямлю, падрыхтаваць уперадзе загараджальны агонь артылерыйскіх батарэй. Кіпіць работа ў артылерыстаў на назіральным пункце. Але праціўнік хутка вызначыў месца, з якога мы кіруем агнём і дзейнасцю наступаючых, і, выклікаўшы агонь артылерыі буйнога калібра, вырашыў знішчыць нас. Прамое пападанне снарада ў вугал дома, і мы вымушаны перанесці свае прыборы назірання на пляцоўку першага паверха. Ад наступных пападанняў загараецца дах дома. Пераносім зброю і прыборы ў падвал, прыстасоўваемся для стральбы і назірання адтуль. Пад покрывам ночы заліваем астаткі пажарышча, расчышчаем сектары агляду і абстрэлу, устанаўліваем сувязь. Байцы і камандзіры працуюць непрыкрытыя, да сцен памяшкання нельга датыкнуцца, але ваданравод застаўся цэлым, і вада дапамагае аднаўляць сілы.

27-ю гадавіну Савецкіх Узброеных Сіл знамянуем дакладам старшаму камандзіру аб гатоўнасці да кіравання агнём батарэй, да адпору контратак праціўніка, якія хутка пачалі зноў паўтарацца. Але цяпер яны нам былі не страшныя, цяпер наша пяхота будзе прыкрыта агнём батарэй.

**М. РУДЧАНКА,**
**старшы выкладчык ваеннай кафедры.**

*Успамінаюць ветэраны*

* * *

## НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ, НІШТО НЕ ЗАБЫТА

У любым горадзе нашай рэспублікі, вялікім або малым, стаяць абеліскі, гранітныя або мармуровыя, увенчаныя пяціканцовай зоркай з прозвішчамі тых, хто загінуў, але выстаяў; ёсць і іншыя, без прозвішчаў і імён, і тады мы называем іх магілай невядомага салдата. Мне прыйшлося быць сведкай таго, як узнікла адна з такіх магіл. Недалёка ад нашай школы праводзілі земляныя работы і знайшлі магілу, дзе былі пахаваны чацвёра нашых салдат. Там былі знойдзены два медальёны, фляга, амаль сатлеўшыя шынялі і боты.

Салдат перазахавалі на Чыжоўскіх могілках; рэчы былі аддадзены на экспертызу, але, на жаль, экспертыза нічым не змагла нам дапамагчы.

Хто ж усё-такі гэтыя чацвёра, як яны загінулі? Мясцовыя жыхары расказалі, што загінулі яны ў чэрвені 1941 года ў самым пачатку вайны, калі нашы часці з баямі пакідалі Мінск. З гэтых расказаў мы даведаліся, што ў тыя ж самыя дні тут, амаль у цэнтры Мінска, у раёне Чэрвеньскага тракта, адбыўся адзін з тых многіх мясцовых баёў. У гэтым баі загінула 138 чалавек, іх астанкі былі выяўлены раней...

Так, 142 невядомыя героі, імёны якіх трэба знайсці, вырваць з забыцця. Расказала аб гэтым аднакурснікам, слухалі ўважліва; многія выказалі жаданне прыняць удзел у пошуку. Так узнікла пошукавая група, выбралі штаб з 6 чалавек. Работу сваю мы толькі пачалі, а яна нялёгкая і не абяцае хуткага выніку.

Мы не ведаем, удачным ці няўдачным будзе наш пошук, аб гэтым цяпер цяжка сказаць. Мы сустракаемся з былымі падпольшчыкамі, воінамі, проста добрымі савецкімі людзьмі — і на вачах ажывае гісторыя.

Ну, а нашы бліжэйшыя планы — гэта паездка ў Астрашыцкі гарадок, у школу, дзе сабрана шмат матэрыялаў пра абарону Мінска, пра воінскія злучэнні, якія апошнімі пакідалі горад; гэта цесная сувязь з музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які абяцаў сваю дапамогу, і, акрамя таго, усё тыя ж сустрэчы. У нас шмат адрасоў, прозвішчаў людзей, якія хоць чымсьці могуць нам дапамагчы. Гэта, напрыклад, Віктар Цярэшчанка і яго маці — сведкі пахавання загінуўшых, сям'я Пагоцкіх, у якіх адзін час хаваўся ранены ў тым баі лейтэнант; пісьменнік Кузьмічоў, які цяпер піша кнігу аб тых днях вайны і, магчыма, штосьці ведае і аб нашым баі. Я гавару «нашым баі» таму, што ён сапраўды стаў нашым боем, боем з невядомасцю і забыццём.

**І. БУГРОВА,**
**студэнтка гістфака.**

## РАСТУЦЬ ПАТРЫЁТЫ

ГЭТЫ СТЭНД, апаратыўна аформлены ваеннай кафедрай Белдзяржуніверсітэта, называўся «Імі ганарыцца універсітэт». Пра каго ён расказвае?

Напэўна, многія студэнты не ведалі выпускніка геафака Івана Сцяпуру, які праходзіць службу ў далёкім гарнізоне. Матэрыялы стэнда пазнаёмілі з ім, і ніхто не застаўся абыякавым. Выдатна характарызуючы баявыя і службовыя якасці маладога лейтэнанта, камандаванне паведамляла універсітэту аб тым, як ён, рызыкуючы жыццём, выратаваў дзіця, якое танула. Ці можна лепш атэставаць афіцэра, які вырашыў звязаць свой лёс з Узброенымі Сіламі? Яго ўчынак не выпадковы. Гатоўнасць да подзвігу, мужнасць закладваліся ва універсітэце, дзе адпрацавана дзейсная сістэма ваенна-патрыятычнага выхавання, сапраўдным цэнтрам якога з'яўляецца ваенная кафедра. Уся гэта дзейнасць адзначана граматай Усесаюзнага камітэта ветэранаў вайны, узнагародамі ЦК ДТСААФ. Поспехі прыйшлі дзякуючы цеснаму, пастаяннаму «ўзаемадзеянню» вучэбнага працэсу і ўсіх форм і метадаў абаронна-масавай работы і ваенна-патрыятычнага выхавання.

Узяць, скажам, лекцыі па гісторыі Узброеных Сіл краіны. Іх можна адчытаць, не клапоцячыся аб эфектыўнасці. Ваенная кафедра ВНУ ідзе шляхам пошуку, аналізу. Яна рыхтуе клас тэхнічных сродкаў навучання, дзе лекцыі будуць весціся з дапамогай магнітафонных запісаў, картаграм, кінамантажу. Ярка, перака наўча.

Клопат аб эмацыянальным уздзеянні на слухачоў — зусім апраўданы. Чаму, напрыклад, глыбокі след у душах студэнтаў пакідае наведанне музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, нават у тых, хто там бываў раней? На мой погляд, адказ на пытанне заключаецца ў тым, што да расказаў, тлумачэнняў прыцягваюцца тут не толькі гіды, але і людзі, чые партрэты экспануюцца тут. Расказы сведкаў — незамяняльныя па ўражлівасці.

Не старэе і такая выпрабаваная зброя выхаваўчага арсеналу, як правядзенне тэматычных вечароў. Іх у мінулым годзе ва універсітэце праведзена 48. Пабывала на вечарах больш як 15 тысяч чалавек. У арганізатараў няма прытворнага захаплення колькасцю і грандыёзнасцю праводзімых мерапрыемстваў. Калі раней такія вечары рыхтавалі работнікі ваеннай кафедры, апарат пярвічнай арганізацыі ДТСААФ, то цяпер у гэту работу непасрэдна ўключаліся самі студэнты. І такія вечары, як «Запаветам Леніна верныя» або «У бітвах народжаны, у працы загартаваны, да новых перамог кроч, камсамол!», прайшлі на высокім эмацыянальным узроўні, з творчай жывінкай, дакладнай арганізацыяй, пры актыўным удзеле запрошаных ветэранаў вайны, вытворчасці, воінаў, былых выпускнікоў.

Памятнай была лістападаўская сустрэча з касманаўтам-2 Германам Цітовым. Забыўшыся на ўсё, слухалі студэнты расказ удзельніка штурму рэйхстага Аляксандра Мацвеевіча Прэлава. Шмат цікавага і павучальнага пачулі яны на сустрэчы з пісьменнікам, аўтарам кніг «Выпрабаванне» і «Якаў Жалязноў», членам КПСС з 1920 года Мікалаем Іванавічам Аляксеевым.

Выхаваўчае насенне такіх сустрэч падае ў добрую глебу. У БДУ ветэранаў (іх тут 350, з іх звыш 200 — выкладчыкі) ведаюць і любяць. Ім прысвечан спецыяльны стэнд. І што важна, ветэраны не стаяць у баку ад патрыятычных спраў і пачынаў моладзі.

Студэнты ВНУ ў мінулым годзе правялі 42 паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы народа, прайшлі па месцах баёў за Беларусь 100-й стралковай дывізіі. У калгасах, саўгасах, на прадпрыемствах разам са студэнтамі, як добры дарадчык і настаўнік, бывае Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр у адстаўцы Аляксандр Васільевіч Кірсанаў, які працуе ў ВНУ начальнікам аддзела. У такіх людзей вучацца студэнты любві да Радзімы, вучацца быць дастойнымі яе сынамі.

Па-сапраўднаму, напрыклад, з поўнай духоўнай аддачай кіруе штабам універсітэцкага клуба «Абавязак» чацвёртакурснік журфака Леанід Екель. Гэты клуб, створаны пры камітэце камсамола БДУ, вядзе пошук матэрыялаў аб выкладчыках і студэнтах, якія гераічна загінулі ў гады мінулай вайны. На аснове пошукавых матэрыялаў студэнты журфака і гістфака рыхтуюць да выдання кнігу нарысаў «Яны змагаліся за Радзіму». Цяпер можна зразумець і ацаніць па вартасці ролю ваеннай кафедры ВНУ ў ваенна-патрыятычным выхаванні студэнтаў, зразумець значэнне, што надаецца створанаму ў ВНУ ваенна-навуковаму таварыству, якое становіцца сапраўдным каардынацыйным цэнтрам методыкі гераіка-патрыятычнай работы ва універсітэце. Работы 11 членаў універсітэцкага ВНТ адзначаны граматамі і дыпломамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. А даследаванні Анатоля Тозіка «Барацьба камсамольцаў і моладзі г. Жлобіна супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны» і Аляксандра Багачова «У. І. Ленін аб абароне сацыялістычнай Айчыны» журы Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх навуках адзначыла дыпломам І ступені і медалямі лаўрэатаў.

Усё гэта дазваляе меркаваць, што навукова-практычная канферэнцыя па праблемах ваенна-патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі, якая павінна адбыцца ў ВНУ упершыню, пройдзе на высокім прафесійным узроўні.

**А. ВАЛОШЫН.**
*(«Вячэрні Мінск», № 38).*



*У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ля легендарных «кацюш».*

*Студэнты БДУ ў падшэфнай воінскай часці.*

Фота В. Жука.



